Беларусь.info

№75 16/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**10 чалавек удзельнічаюць у акцыі пратэсту, патрабуючы спыніць перасьлед апазыцыйнай моладзі, вернікаў-хрысьціянаў, а таксама вызваліць палітвязьняў. 19-я суткі працягваецца галадоўка.** Галадоўнікаў падтрымалі прадстаўнікі аб’яднаных дэмсілаў, а таксама замежныя партнэры незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт”. Экс-кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Мілінкевіч прасіў галадоўнікаў спыніць акцыю, але тыя зь ім не пагадзіліся.

**У Маскве чацвёра скінхедаў збілі грамадзяніна Беларусі Кастуся Беляўца.** Скінхеды напалі на 15-летняга Кастуся, жорстка збілі, зламалі сківіцу і забралі тэлефон, выкрыкваючы пры гэтым "Слава Расіі!". Пацярпелы шпіталіваны. Айчым Кастуся Беляўца напісаў заяву ў міліцыю. Андрэй Азараў таксама паведаміў, што тэлефон беларускай амбасады ў Маскве ўвесь час заняты, і ён не можа звярнуцца туды па дапамогу.

**Адвакаты Казуліна просяць сьледчых дапытаць Лукашэнку**. Адвакаты Аляксандра Казуліна заявілі хадайніцтвы аб дапаўненьні сьледзтва, якое яны лічаць недастатковым і неаб’ектыўным. У ліку хадайніцтваў, якія падалі адвакаты былога кандыдата на прэзыдэнта, ёсьць і просьба дапытаць кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнку.

**Вывучэньне справы актывістаў "Партнэрства" працягнутае яшчэ на месяц**. Вывучэньне ў судзе справы актывістаў “Партнэрства” працягнулі яшчэ на месяц. Пра гэта паведамілі ў канцылярыі Цэнтральнага суду Менска, у якім будзе слухацца справа. Вывучаць справу яшчэ месяц дазволіў старшыня суду.

# Факты

**Санкцыі ЭЗ адносна беларускіх чыноўнікаў падтрымалі яшчэ 10 краін**. Да фінансавых санкцый Эўразьвязу адносна 36 высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, сярод якіх кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка, далучыліся яшчэ 10 краінаў – Альбанія, Баўгарыя, Боснія і Герцагавіна, Ісьляндыя, Ліхтэнштэйн, Македонія, Румынія, Нарвэгія, Сэрбія і Харватыя. Яны выказалі гатоўнасьць узгадніць сваю палітыку з рашэньнем краін Эўразьвязу.

# Цытаты

**Лукашэнка назваў Леніна і Сталіна сымбалямі нашага народа: “**Тое, што я ведаю пра савецкіх кіраўнікоў, пачынаючы ад Леніна, Сталіна і да цяперашніх кіраўнікоў, сёньня мана дасягае да 100 працэнтаў. Нам навязваюць, каб мы забыліся ўсё вялікае, тое, што зрабілі гэтыя людзі, а гэта ж – сымбалі нашага народа”.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org

**Віцебская абласная рада ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" сумесна з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі ладзіць літаратурныя сустрэчы, прысвечаныя Васілю Быкаву.** Свята адбудзецца 18 чэрвеня 2006г., у "Мазурына" з 12 гадзін дня на летняй эстрадзе.